**А. М. Палуян, З. У. Шведава**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ПРАКТЫКААРЫЕНТАВАНАГА НАВУЧАННЯ НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Сёння намаганні выкладчыкаў філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» накіраваны на ўдасканаленне падрыхтоўкі выкладчыкаў беларускай / рускай мовы і літаратуры, літаратурна-рэдакцыйных супрацоўнікаў,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

спецыялістаў у галіне камп'ютарнай філалогіі. Распрацаваны, зацверджаны і ўведзены ў дзеянне новыя адукацыйныя стандарты па кожнай спецыяльнасці нашага факультэта [1], укараняюцца ў навучальны працэс інавацыйныя, больш эфектыўныя тэхналогіі навучання і выхавання, паляпшаецца змястоўна-тэхналагічнае і навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійнай падрыхтоўкі, павялічваецца доля самастойнай работы студэнтаў. Кіраўніцтва ўніверсітэта ставіць задачу павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з улікам сучасных навуковых дасягненняў, сусветных тэндэнцый і асаблівасцей развіцця сферы будучай прафесійнай дзейнасці.

Практыкаарыентаванае навучанне накіравана, перш за ўсё, на фарміраванне акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый і на разуменне таго, дзе, як і для чаго гэтыя кампетэнцыі трэба выкарыстоўваць. Сёння студэнт павінен не толькі атрымаць веды, але і набыць практычны вопыт іх выкарыстання для вырашэння жыццёва важных праблем і задач. Відавочна, што розныя віды практык якраз і спрыяюць набыццю практычнага вопыту ў сваёй прафесійнай сферы.

Згодна з адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі на спецыяльнасцях 1–21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) і 1–21 05 02 Руская філалогія (па напрамках) на працягу чатырох год навучання студэнт павінен прайсці дзве вучэбныя практыкі – фальклорную і дыялекталагічную; вытворчую па напрамку спецыяльнасці – літаратурна-рэдакцыйную ці практыку па камп'ютарным забеспячэнні філалагічнай дзейнасці; пераддыпломную (педагагічную).

Для студэнтаў 3 курса спецыяльнасці 1–21 05 02 Руская філалогія ў вучэбны план уключана вучэбная азнаямленчая практыка, а студэнты 3 курса спецыяльнасці 1–21 05 01 Беларуская філалогія наведваюць педагагічны практыкум. Акрамя таго, для ўзмацнення практыкаарыентаванай скіраванасці навучання студэнтаў напрамку «Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць» уведзены факультатыўны курс «Аўдыёвізуальныя і друкаваныя СМІ», які праводзіць намеснік дырэктара РУП РТЦ «Тэлерадыёкампанія «Гомель» Д.А. Дзянісаў.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам пры праходжанні розных відаў практык фарміруюцца ці развіваюцца такія акадэмічныя кампетэнцыі, як уменне «выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач; працаваць самастойна»; валоданне «міждысцыплінарным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падыходам пры рашэнні праблем; навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі; навыкамі, звязанымі з выкарыстаннем тэхнічных прыстасаванняў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам» [1, с.8].

Усе віды практык дапамагаюць выпрацаваць і сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі будучага філолага, сярод якіх здольнасць да сацыяльных кантактаў, да міжасабовай камунікацыі, да крытыкі і самакрытыкі; уменне працаваць у калектыве [1, с.8].

У час праходжання вучэбных фальклорнай і дыялекталагічнай практык неабходна набыць навыкі збіральніцкай дзейнасці, сфарміраваць здольнасць прадстаўляць вынікі навуковай-даследчай працы ў адпаведнасці з патрабаваннямі, а таксама карыстацца «навуковай і даследчай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах» [1, с.9].

У працэсе літаратурна-рэдакцыйнай вытворчай практыкі студэнты знаёмяцца «са спецыфікай арганізацыі працоўнага працэсу ў выдавецтвах рознага профілю і ўласнасці, перыядычных выданнях рознага профілю, сродках масавай інфармацыі (радыё, тэлебачанне і інш.), метадыкай рэдактарскай справы, тыпалогіяй выданняў, відамі тэкстаў і асаблівасцямі працы з імі» [1, с.28], асвойваюць сучасную методыку рэферавання і рэдагавання тэкстаў.

Вытворчая практыка па камп'ютарным забеспячэнні філалагічнай дзейнасці накіравана на замацаванне ўменняў і навыкаў вырашэння прафесійных задач з прыцягненнем тэхналогій, метадаў і інструментальных сродкаў камп'ютарнай лінгвістыкі, уключаючы камп'ютарную (электронную) лінгвадыдактыку» [1, с.28].

Азнаямленчая вучэбная практыка накіравана на знаёмства студэнтаў «з арганізацыяй вучэбнага працэсу ва ўстановах адукацыі; на вывучэнне вучэбных праграм, падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў па прадмету; на назіранне за навучаннем (дзейнасцю педагога) і вучэннем (дзейнасцю навучэнцаў) у працэсе наведвання заняткаў па прадмету» [2, с.41].

Педагагічная перадыпломная практыка накіравана на правядзенне вучэбнай работы ў якасці настаўніка адпаведнага прадмета; выхаваўчай і культурнай работы ў якасці класнага кіраўніка; навукова-даследчай працы па псіхолага-педагагічных праблемах; удзел у метадычнай працы ўстановы адукацыі; ацэнку прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, набытых падчас праходжання практыкі. У выніку студэнт-практыкант павінен «1) замацаваць і ўдасканаліць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

веды, атрыманыя падчас вывучэння лінгвістычных, літаратуразнаўчых і псіхолага-педагагічных дысцыплін; 2) авалодаць асноўнымі прафесійнымі ўменнямі настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка» [1, с.28].

У выніку планамернай работы мы павінны атрымаць спецыяліста-філолага, здольнага «да падрыхтоўкі і правядзення заняткаў з навучэнцамі, распрацоўкі навукова-метадычнага забеспячэння; выкарыстання дасягненняў навукі і передавых тэхналогій у галіне навуковых, адукацыйных і практыкаарыентаваных працэсаў; распрацоўкі планаў і праграм арганізацыі адукацыйнай і інавацыйнай дзейнасці ў прафесійнай сферы» [1, с.8].

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1 -21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): АСВА 1-21 05 01-2013. – Уведзены ў дзеянне 30.08.2013. – Мінск: Мін-ва адукацыі Рэсп. Беларусь: РІВШ, 2013. – 31 с.

2. Образовательный стандарт высшего образования. Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1 -21 05 02Русский филология (по направлениям): ОСВО 1-21 05 02-2013. - Введен в действие 30.08.2013. - Минск: Мин-во образования Респ. Беларусь: РИВШ, 2013. - 45 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ